**Л. І. ЛЯМНЁВА,**
метадыст вышэйшай катэгорыі
Верхнядзвінскага аддзела адукацыі, спорту і турызму,
**М. Г. КЛІМЕНЦЬЕВА,**
настаўніца Верхнядзвінскай гімназіі

# ЯКУБ КОЛАС. «ДУМКІ Ў ДАРОЗЕ»

## (план-канспект урока ў VII класе)

**Мэта:** садзейнічаць усведамленню вучнямі думкі, што паэзія і проза ў мастацкай літаратуры заўсёды цесна спалучаны між сабой і ўзаемадзейнічаюць; развіваць камунікатыўныя ўменні і творчыя здольнасці сямікласнікаў.

**Задачы:** выявіць першаснае ўспрыманне твора Якуба Коласа «Думкі ў дарозе» і акцэнтаваць увагу вучняў на яго адрозненні ад іншых празаічных твораў; развіваць уменне знаходзіць у празаічных творах адзнакі вершаваных; садзейнічаць развіццю аналітыка-сінтэтычнага мыслення вучняў; стварыць умовы для выхавання патрыятычных і грамадзянскіх пачуццяў.

**Прагназуемы вынік:** мяркуецца, што па заканчэнні ўрока вучні будуць *ведаць:* азначэнне паняцця «лірычная проза», яго асноўныя характарыстыкі; *умець:* знаходзіць у празаічных творах адзнакі вершаваных (павышаную эмацыянальнасць, асаблівую ўзнёслую настраёвасць), вызначаць ролю вобразна-выяўленчых сродкаў (паўтораў, клічных і пытальных зваротаў, вобразаў-сімвалаў).

**Месца ў тэме:** першы ўрок па раздзеле «Паэзія ў прозе і проза ў паэзіі».

**Тып:** урок вывучэння новага матэрыялу.

**Формы, метады і прыёмы:** франтальная гутарка, часткова-пошукавы, індывідуальная, парная праца, «Каляровыя фігуры», «Тэлеграма».

**Абсталяванне:** вучэб. дапам. па беларус. літаратуры для VII класа (2010), партрэт Якуба Коласа, кластары, карткі з тэкстамі, каляровыя фігуркі, памяткі, творчыя заданні, бланкі тэлеграм.

**Эпіграф:**

Мой родны кут, як ты мне мілы!..
Забыць цябе не маю сілы!
Не раз, утомлены дарогай,
Жыццём вясны мае убогай,
К табе я ў думках залятаю
І там душою спачываю.

*Якуб Колас.*

### Ход урока

**І. Арганізацыйны момант** *(1 хв.).*

**Настаўнік.** Скажыце, які ў вас сёння настрой? Давайце падумаем пра што-небудзь прыемнае, усміхнёмся адно аднаму і пачнём нашу працу. Вынікі павінны быць добрымі, таму што няма нічога лепшага, чым цудоўны настрой.

**ІІ. Мэтавызначэнне** *(5 хв.).*

**Настаўнік** *(пасля агучвання тэмы ўрока).* Выходзячы з тэмы ўрока, давайце выберам мэты, якія мы перад сабой паставім.

1. Даведацца пра асаблівую разнавіднасць мастацкіх твораў — лірычную прозу.
2. Разгледзець змест аповесці Я. Брыля «Сірочы хлеб».
3. Умець знаходзіць прыкметы лірыкі ў прозе.
4. Пазнаёміцца з прыкладамі твораў лірычнай прозы (урыўкі з аповесці Я. Брыля «Сірочы хлеб» і М. Лупсякова «Мэры Кэт»).
5. Падрыхтаваць інсцэніроўку паводле ўрыўка з эпічнага твора.

**Адказы:** 1, 3, 4.

**ІІІ. Актуалізацыя ведаў.**

**Настаўнік.** Для таго каб перайсці да вывучэння новага раздзела, нам неабходна ўспомніць вядомыя паняцці «проза» і «паэзія».

Запоўніце кластары ў парах (па радах).
І варыянт — проза;
ІІ варыянт — паэзія.

**I варыянт**




**Словы для даведак:** *сюжэт:* прысутнічае, адсутнічае; *мова:* рытмічная, эмацыянальная, вобразная, празаічная, свабодная, арганізаваная; *аб'ём:* невялікі, розны (апавяданне, аповесць, раман); *вобразныя сродкі:* невялікая колькасць, багацце розных сродкаў (эпітэтаў, метафар, параўнанняў і г. д.).

**II варыянт**




**Словы для даведак:** *сюжэт:* прысутнічае, адсутнічае; *мова:* рытмічная, эмацыянальная, вобразная, празаічная, свабодная, арганізаваная; *аб'ём:* невялікі, розны; вобразныя сродкі: невялікая колькасць, багацце розных сродкаў (эпітэтаў, метафар, параўнанняў і г. д.).

Пасля запаўнення кластараў адбываецца іх праверка і абмеркаванне.

**IV. Вывучэнне новага матэрыялу** *(9 хв.)*.

Настаўнік. Вы пазнаёміліся з двума рознымі відамі літаратурных твораў. І, здавалася б, ужо можаце арыентавацца ў вялікім кніжным моры, якое называецца «мастацкая літаратура»: адна яе частка — паэзія, вершы, а другая — проза.

Аднак у літаратуры, як і ў жыцці, не ўсё так проста. Паміж гэтымі двума відамі мастацкай творчасці няма рэзкага размежавання. У літаратуры можна сустрэць нямала твораў, напісаных празаічнай мовай, але з выразнымі адзнакамі паэзіі — павышанай эмацыянальнасцю, багаццем мастацкіх сродкаў, узнёслай настраёвасцю мовы.

Дарэчы, такія асаблівасці можна заўважыць і ў творах, змешчаных у нашым падручніку, дакладней, у вучэбным дапаможніку. Асобныя старонкі напісаны вельмі пранікнёна, задушэўна. Пра такія творы гавораць, што гэта паэтычная (або лірычная) проза.

Праца ў парах.

Прачытайце ўрыўкі з твораў і знайдзіце ў іх прыкметы лірыкі.

1) Сонца, мароз і вецер. Эх, завірыў, разгуляўся!.. Так і скрабе па хрупкім снезе, так і падвільвае белымі вужакамі снежнага пылу. Гоніць яго па полі, цераз гасцінец, зноў па полі, па хмызняках і — пад саменькі лес. А сонца такое, што не зірнеш на снег!..

Ад сонца Даніку цёпла — цёпла ад бацькавага салдацкага башлыка, ад вялікага, з чужых плячэй, паўкажушка, ад хады па глыбокай сцежцы *(Янка Брыль. «Сірочы хлеб»)*.

2) Я люблю вясну, калі з трэскам ломіцца на рацэ лёд і гаманкія поўныя воды нясуць крыгі…

Я люблю таксама восень з яе першымі яснымі днямі, дажджом, з першымі замаразкамі і маразамі. А зіма! А першы снег! А іней на дрэвах і лёд на рацэ! І конь, запрэжаны ў сані, што імчыцца некуды далёка па дарозе! *(Мікола Лупсякоў. «Мэры Кэт»)*.

Адказ: у прыведзеных тэкстах выяўлены глыбокія пачуцці і эмоцыі аўтара, стан яго душы, заўважаюцца адзнакі рытмічнасці, яркасць і вобразнасць мастацкіх сродкаў.

Настаўнік. Сапраўды, гэта паэтычная (або лірычная) проза.

Давайце звернемся да памяткі і больш падрабязна пазнаёмімся з паняццем «лірычная проза». Падкрэсліце алоўкамі ключавыя словы.

**Лірычная проза** — гэта разнавіднасць мастацкай прозы, якая вылучаецца павышанай эмацыянальнасцю і адкрытым, непасрэдным выяўленнем аўтарскіх адносін да паказу жыцця.

*Характарыстыка паняцця «лірычная проза»*

1. Павышаная эмацыянальнасць мовы.
2. Аслабленасць сюжэта, лірычнасць аповеду.
3. Сцісласць, лаканізм зместу.
4. Выяўленне светаўспрымання аўтара.
5. Прадмет адлюстравання — духоўнае (унутранае) жыццё чалавека, свет яго думак і пачуццяў. Асаблівае месца ў творы займае вобраз-перажыванне.

**V. Аналіз твора** *(17 хв.).*

Настаўнік. Сапраўдным майстрам прозы і паэзіі з'яўляецца Якуб Колас. Яго пяру належаць вельмі пранікнёныя, прачулыя творы, у якіх тонка выяўлены думкі, эмоцыі і перажыванні аўтара.

• Якія пачуцці выклікае ў вас эпіграф? *(Адказы вучняў.)*

• Згадайце вядомыя вам творы Якуба Коласа. *(«Сымон-музыка», «Новая зямля», «Ручэй», «У старых дубах».)*

Настаўнік. Сёння мы пазнаёмімся з Якубам Коласам як з майстрам лірычнай прозы.

Звернемся да вучэбнага дапаможніка, адгарніце яго на старонцы 213. Зачытайце назву твора.

• Пра што думае чалавек, калі збіраецца ці выпраўляецца ў дарогу? *(Адказы вучняў.)*

• Чаму ў дарозе добра думаецца? *(Разважанні вучняў.)*

Пасля чытання твора настаўнік звяртаецца да прыёму «Каляровыя фігуры» і задае пытанні.

• Выберыце з прапанаваных фігур той колер, які найбольш адпавядае вашаму настрою пасля прачытання твора. Абгрунтуйце свой выбар. *(Адказы вучняў.)*

• Якім паўстае перад намі герой твора? *(Уважлівы, удумлівы, патрыёт.)*

• Да якіх вобразаў на працягу ўсяго твора звяртаецца аўтар? *(Да вобразаў дарогі і неба.)*

***Фізкультхвілінка.***

**VI. Працяг вывучэння твора.**

Настаўнік. Герой твора ў сваіх роздумах і разважаннях пра долю роднай краіны звяртаецца да неба і дарогі. І гэта невыпадкова. Прырода — яго чулы сябар і суразмоўца, ёй аўтар давярае свае думкі і пачуцці.

• На якія пытанні ён шукае адказы? Знайдзіце і зачытайце. *(«І куды ты нясеш мяне, невядомая дарога? Далёкае, сіняе неба! Чаму не дасі адказу на нашу пакуту, на нашы надзеі, на нашы блуканні? Чаму не асушыш нашы горкія слёзы? Не супакоіш хворую душу і сэрца? Чаму не папаліш агнём справядлівым таго ліхога звера, што сее заразу, топча праўду і носіць няшчасце па нашай зямлі?»)*

• Чаму такія пытанні хвалююць аўтара? *(Колас — патрыёт, які моцна любіць сваю бацькаўшчыну, яго хвалюе лёс народа.)*

• Ці могуць даць адказ на гэтыя спрадвечныя пытанні-роздумы неба і дарога, да якіх яны звернуты? *(Не, не могуць. Сам аўтар гаворыць пра тое, што неба тысячы, мільёны гадоў пазірае на ўсіх роўна без болю, без трывогі. Дарога, таксама, як і неба, маўчыць. Яна занята сваёй справай: ідзе, круціцца, абвіваецца, узбягае, спускаецца, прападае і... нясе героя.)*

• Як называюцца такія пытанні, на якія ў тэксце няма адказу? *(Рытарычныя.)*

• Неба і дарога выступаюць у творы як вобразы-сімвалы. Давайце паразважаем, што яны сімвалізуюць. *(Дарога — спрадвечны сімвал руху наперад, да новага жыцця; неба — сімвал чагосьці недасягальнага і вечнага.)* Можна звярнуцца да слоўніка літаратуразнаўчых тэрмінаў.

• Якія яшчэ па інтанацыі сказы мы заўважаем у творы? *(Клічныя.)* Зачытайце іх. *(А неба! Далёкае, невядомае, сіняе неба! Далёкае неба, сіняе неба! А далёкія зорачкі! Як добра ў ціхую ночку!)* Што яны выяўляюць? *(Лірычнасць, эмацыянальнасць аўтарскага голасу.)*

• Зачытайце сказы, якія падзелены на кароткія часткі, што па гучанні нагадваюць вершаваныя радкі. *(...Бягуць лясы, гаі, грамадзяцца горы, рассцілаюцца шырокія лугі, блішчаць азёры, срэбрам пераліваюцца рэкі, золатам рассыпаюцца пяскі, глыбокімі зялёнымі ямамі раскідаюцца балоты. Высокае сонца, белыя хмаркі, як пух, плывуць і плывуць адна за адною, родзяцца, прападаюць, сплываюцца ў цёмную хмару, звісаюць над полем і лесам, блішчуць маланкамі, трасуцца громам, разліваюцца чыстымі халоднымі кроплямі і шчыра льюцца на зямлю.)*

• Назавіце мастацкія прыёмы і сродкі, ужытыя ў творы, якія выконваюць тую ж ролю, што і ў вершы: метафары, эпітэты, параўнанні, паўторы. ***(Параўнанні:** «распаўзліся па полі, **як чэрві ў нягоду**, бедныя мужыцкія хаты»; мужыцкая вёска пазірае, **як сірата** між людской будовы; срэбраны месячык, **як серп. Эпітэты:** няведамая дарога, далёкае, няведамае неба; пазіраеш на **бедную зямлю**, залітую **горкімі слязьмі**; срэбраны месячык,*

*высокае сонца, ціхая ночка). **Метафары:** бягуць лясы, рассцілаюцца шырокія лугі, грамадзяцца горы. Блішчаць азёры, пераліваюцца рэкі, раскідаюцца балоты, хмаркі блішчуць маланкамі, трасуцца громам, разліваюцца кроплямі. Дарога круціцца, абвіваецца, узбягае, спускаецца. Думкі родзяцца ў сэрцы. **Паўторы:** Далёкае неба! Сіняе неба! Куды ты нясеш мяне няведамая дарога?)*

• Звярніцеся да памяткі і, карыстаючыся ёю, дакажыце, што «Думкі ў дарозе» — лірычная проза.

**VII. Творчая работа** *(9 хв.).*

Настаўнік *(прапануе заданне на выбар).* 1) Паспрабуйце ўявіць сябе ў ролі празаіка, дапоўніце ўрывак з твора Якуба Коласа ўласнымі думкамі-разважаннямі; 2) устаўце ў тэксце на картцы прапушчаныя словы і знакі прыпынку.

Ёсць нешта незвычайна прыгожае ў гэтых ... *(прывольных старасвецкіх)* шляхах Беларусі. ... *(Шырока і размашыста)* пралягаюць яны ад вёскі да вёскі, ад мястэчак да гарадоў. Колькі хараства і чароўнага прывабу ў ... *(сініх)* іх далях ... *(!)* Колькі новых малюнкаў, свежых матываў і таемных здарэнняў абяцаюць яны вачам і сэрцу падарожнага ... *(!)* З якой ... *(незвычайнай)* сілай клічуць яны да сябе і як моцна дакранаюцца да струн душы! Якая ж сіла заложана ў гэтых прасторах ... *(неабдымных родных)* шляхоў і якую ўладу маюць яны над табою, неспакойны, ... *(вечна заклапочаны)* падарожны ... *(?)*

Эх, шляхі, ... *(родныя)* шляхі! Хто перакажа нам вашы казкі, разгадае думкі,назбіраныя і напісаныя часамі? *(Паводле Якуба Коласа).*

**VIII. Дамашняе заданне** *(1 хв.).*

Навучыцца выразна чытаць твор Якуба Коласа «Думкі ў дарозе», падрыхтаваць адказы на пытанні ў вучэбным дапаможніку (с. 213—215).

**IX. Рэфлексія** *(3 хв.).*

Настаўнік. Кожны з нас ідзе па жыцці сваёй дарогай і на сваім шляху сустракаецца з іншымі людзьмі. Нашы жыццёвыя сцежкі і дарогі сёння сышліся ў гэтым класе. Кожны чалавек у нашым жыцці і памяці пакідае свой след. Хочацца, каб вы падзяліліся думкамі і напісалі, які след у вашай душы пакінуў сённяшні ўрок. Сцісла напішыце пра гэта ў тэлеграме да мяне. Дзякую вам за працу!